Да простых людзей прымяняліся цялесныя пакаранні. У той час яшчэ існавала прыгоннае права, таму феадал меў правы чыніць суд над залежнымі сялянамі і прызначаць ім пакаранні, часцей за ўсё цялесныя.

У адрозненні ад простых людзей у шляхты былі і свае віды пакаранняў. Толькі шляхта магла пазбавіцца гонару, бо лічылася, что ў іншых яго няма. Пазбаўленне гонару азначала страту шляхецтва і ўсяго шляхецкага маёнтка. Пазбаўляліся гонару шляхцічы, якія ўцяклі з поля бою, выгнаннікі (вываланцы), злачынцы, якія былі асуджаны да пакарання смерцю, але потым памілаваны.

Да ліку дапаўняльных відаў пакарання, на думку навукоўцаў, належалі: выгнанне, пазбаўленне спадчынных правоў і пакаянне. Акрамя таго, у асобныя дзве групы можна вынесці замяняючыя пакаранні, якія прымяняліся ў якасці замены іншых відаў пакаранняў («вываланьe», выдача ў кабалу, выдача ў вечную няволю), а таксама выключныя пакаранні (пазбаўленне пасады).

На жаль, нягледзячы на вялікую варыятыўнасць пакаранняў, статуты ВКЛ ахоплівалі не ўсе яго віды.

***Сідарэнка В. В.***

## ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА ЖАНЧЫН У СТАРАЖЫТНАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЕ Ў IX–XI стст.

*Сідарэнка Вікторыя Вітальеўна, студэнтка 2 курса Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, г. Мінск, Беларусь,*
*sidorenkonika03@gmail.com*

*Навуковы кіраўнік: канд. гіст. навук, дацэнт Лянцэвіч В. М.*

На пачатку фарміравання дзяржаўнасці ва ўсходніх славян на першае месца быў пастаўлены сацыяльна-прававы стан мужчыны як главы сям'і і як кіраўніка дзяржавы. Полацкая зямля, патрыманіяльная дзяржава, мела патрыярхальнае грамадства, у якім дзеяздольнасць жанчын ў значный меры была абмежаванай.

На прававое становішча жанчын на Русі ў IX–XI стст. паўплывалі тры асноўныя новыя фактары: фарміраванне і развіццё дзяржаўнасці, зараджэнне і ўмацаванне феадальных адносін і распаўсюджванне хрысціянства.

Рэлігія ў перыяд сярэднявечча пакінула значны адбітак шляхам укаранення рэлігійных крыніц. Хрысціянства выразна паставіла жанчын на другое месца ў адносінах да мужчын, але царква асабліва паважліва ставілася да жанчын-маці і асуджала праявы гвалту ў адносінах да жанчын як у сям'і, так і за яе межамі.

Старажытнарускае права ў адносінах да жанчын рэгулявала галоўным чынам прыватнаправавую сферу. Першае згадванне аб паўнамоцтвах жанчын на валоданне пэўнай маёмасцю змяшчае адзін з найбольш ранніх юрыдычных помнікаў – дагавор 911 г. Алега з Візантыяй, у якім было зацверджана права жанчыны захаваць за сабой частку агульнай з мужам

маёмасці, нават у выпадку, калі муж здзейсніў забойства і паўстаў перад законам. Увогуле, праваздольнасць старажытнарускіх жанчын была значнай у параўнанні з іх заходнееўрапейскімі сучасніцамі, але яна не магла канкурыраваць з праваздольнасцю мужчын. У Старажытнарускі перыяд (IX–XI стст.) жанчына валодала правам на пасаг, спадчыну і некаторую іншую маёмасць. Адзіным выключэннем абмежавання ў праве распараджэння сваёй маёмасцю з'яўляўся арт. 7 Рускай Праўды, паводле якога жонка і дзеці чалавека, які здзейсніў забойства без прычыны, падвяргаліся разам са злачынцам пакаранню ў выглядзе выгнання і канфіскацыі маёмасці.

Права жанчыны на выбар мужа было нікчэмна. Гэты працэс знаходзіўся цалкам пад кантролем сям'і, у першую чаргу – бацькі. Да прыняцця хрысціянства існаваў абрад выкрадання – «умычка», які выключаў права дзяўчыны на выбар жаніха. Пасля прыняцця хрысціянства ў 988 г. шлюб паміж маладымі таксама мог быць заключаны толькі са згоды бацькоў.

Пасаг служыў асновай асобнай маёмасці жонкі. З яго з'яўленнем пачалося юрыдычнае вызначэнне становішча дачкі ці сястры ў сям'і, яе прававога стаўлення да сямейнай маёмасці. Па Рускай Праўдзе, сястра пры братах не з'яўлялася спадчынніцай, пры гэтым браты павінны былі задаволіць яе лёс, аддаўшы замуж, з пасільным пасагам. Пры адсутнасці братоў дачка – паўнапраўная спадчынніца бацькоўскай маёмасці ў земляробчай сям'і. У адпаведнасці з арт. 93, муж мог пакінуць спадчыну жонцы, і яна з'яўлялася спадарыняй гэтай маёмасці, але не астатняй часткі спадчыны. У выпадку смерці мужа жанчына станавілася паўнапраўным апекуном дзяцей і распараджалася маёмасцю, а па дасягненні дзецьмі паўналецця маці магла заставацца ў доме, нават супраць волі дзяцей (арт. 102). Але калі маці паўторна выходзіла замуж, то дзеці і частка іх спадчыны перадаваліся блізкаму сваяку (арт. 99).

Працэсуальнае права X–XI стст. не абмяжоўвала жанчын, аднак з практыкі вынікала, што жанчыны ў ролі сведкаў і тым болей суддзяў выступалі вельмі рэдка. За жанчыну, калі яна выступала як аб'ект злачыннай дзеі, старажытнарускае заканадаўства не прадугледжвала іншага пакарання, зыходзячы з палавой прыкметы, – за забітага рамесніка ці рамесніцу выплачвалася 12 грыўняў (арт. 12 Рускай Праўды). Пры гэтым, з улікам сацыяльнага становішча, пры забойстве жонкі вінаватага судзілі па той жа працэдуры, што і за забойства мужа, з выплатай 20 грыўняў пры даказанні віны, але калі жанчына была смердам, выплата грошай не прадугледжвалася (арт. 88).

Неабходна адзначаць, што фармальна жанчыны мелі менш правоў, чым на самой справе. Абстаноўка ўнутры патрыярхальнай сям'і і грамадства ў цэлым прыводзіла да таго, што жанчына адмаўлялася выкарыстоўваць свае правы ў поўным аб'ёме.

Такім чынам:

1) на правовое становішча жанчын на Русі ў IX–XI стст. паўплывала фарміраванне і развіццё дзяржаўнасці, зараджэнне і ўмацаванне феадальных адносін, распаўсюджванне хрысціянства;

2) асноўнымі правамі жанчын у старажытнарускі перыяд выступалі асабістыя і маёмасныя правы;

3) прававое становішча жанчын у сям'і галоўным чынам рэгулявалася нормамі кананічнага права, а таксама прававым звычаем;

4) адсутнасць магчымасці ў поўнай меры распараджацца правам было прадыктавана традыцыйнай формай грамадства, а таксама патрыярхальным унутрысямейным укладам.

*Тоскина М. В.*

## ДЕКЛАРАЦИЯ О СУВЕРЕНИТЕТЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ И ДЕКЛАРАЦИЯ О СУВЕРЕНИТЕТЕ РСФСР: СХОДСТВА, РАЗЛИЧИЯ, ИСТОРИЧЕСКОЕ ЗНАЧЕНИЕ

*Тоскина Маргарита Викторовна, студентка 1 курса Северо-Западного института (филиала) Московского государственного юридического университета имени О. Е. Кутафина (МГЮА), г. Вологда, Россия, Malefisentadegrats@gmail.com*

*Научный руководитель: канд. юрид. наук Баскова А. В.*

В 1990-е гг. все республики, входившие в состав СССР, приняли специальные правовые акты о суверенитете – декларации. Декларации о суверенитете каждая союзная республика принимала индивидуально, поэтому и содержание, и оформление, и процесс принятия каждой декларации о суверенитете представляется уникальным. Целью настоящего историко-правового исследования стало сравнение деклараций о суверенитете двух старейших союзных республик (входивших в состав СССР с момента его образования) – Российской Советской Федеративной Социалистической Республики и Белорусской Советской Социалистической Республики.

Обе декларации были приняты в 1990 г: Декларация РСФСР была принята Первым Съездом народных депутатов РСФСР 12 июня 1990 г., а Декларация БССР принята на полтора месяца позже – Верховным Советом Республики Беларусь 27 июля 1990 г.

Обе декларации имеют внутреннюю упорядоченную структуру. Декларация РСФСР включает в себя преамбулу и 15 разделов (не обозначены как статьи). Некоторые разделы также разделены на подпункты, например, в пятом разделе их пять, в десятом выделяется один. Декларация БССР также имеет преамбулу и 12 разделов, которые называются статьями.

Преамбулы сравниваемых деклараций частично различаются. Преамбула российской декларации содержит «торжественное» провозглашение государственного суверенитета на всей территории РСФСР. Согласно преамбуле «провозглашение» – выражает волю народов СССР, вызвано «осознанием» депутатами Первого Съезда народных депутатов РСФСР «исторической ответственности за судьбу России» и свидетельствует об «уважении к суверенным правам всех народов, входящих в СССР».